*Г.М. Давыдава*

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

На факультэце даўніверсітэцкай адукацыі адбываецца паглыбленне, сістэматызацыя, удакладненне і пашырэнне запасу ведаў слухачоў пры падрыхтоўцы да тэсціравання па беларускай мове.

Беларускую мову вывучае і збіраецца здаваць на цэнтралізаваным тэсціраванні ў 2016 – 2017 навучальным годзе 20 % ад усіх слухачоў факультэта. У параўнанні з 2015-2016 навучальным годам назіраецца рост (тады было толькі 12 % слухачоў).

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення не толькі рыхтуюцца да цэнтралізаванага тэсціравання па пэўным прадмеце, але і вучацца вучыцца.

Учарашнія школьнікі не зусім падрыхтаваны да навучання ў вышэйшай навучальнай установе. І не толькі праз адсутнасць ведаў, але і псіхалагічна.

На факультэце даўніверсітэцкай адукацыі слухачы адаптуюцца да новых умоў навучання: сістэма выкладання матэрыялу, кантроль ведаў (за перыяд навучання прадугледжаны чатыры кантрольныя работы, па дзве ў кожным семестры, залік у форме тэсту ў зімовую сесію, экзамен у летнюю сесію ў форме, набліжанай да цэнтралізаванага тэсціравання), павялічаная інтэлектуальная нагрузка.

Важнае значэнне пры навучанні мае матывацыя слухачоў. Большасць слухачоў факультэта матываваная. Яны наведваюць усе заняткі, выконваюць хатнія заданні, адказваюць на практычных занятках, нядрэнна выконваюць кантрольныя работы, паспяхова здаюць залікі і экзамены. І становяцца студэнтамі БДУ ці іншых універсітэтаў. Аднак на факультэце ёсць слухачы, якія апынуліся тут выпадкова. Тым не менш мы, выкладчыкі кафедры даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, павінны падырыхтаваць усіх слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання. Пачатковы ўзровень групы (12 слухачоў) у 2016 – 2017 навучальным годзе ад 6 балаў да 71 бала са 100 па беларускай мове (на цэнтралізаваным тэсціраванні ў 2016 годзе). Таму і неабходна рознаўзроўневы падыход да навучання беларускай мове. Абавязкова патрэбны індывідуальны падыход. Камусьці са слухачоў трэба некалькі разоў паўтарыць правілы ўжывання **у** (складовае) ці **ў** (нескладовае), а таму, хто прэтэндуе набраць на тэсціраванні 90 і больш балаў, трэба патлумачыць, што дзеепрыслоўі незаканчанага трывання ўтвараюцца ад дзеясловаў цяперашняга часу ў 3-й асобе множнага ліку: чытаючы – чытаюць, а закончанага трывання – ад інфінітыва: прачытаўшы – прачытаць.

Слухачы не разумеюць, што тэсты на цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове, як і па іншых вучэбных прадметах, маюць пэўную сістэму. Напрыклад, у заданне па сінтаксісе і пунктуацыі: адзначце сказы з адасобленымі членамі сказа, дзе трэба паставіць коскі, не ўключаюць устаўныя канструкцыі ці іншыя тэмы. Для таго каб добра выканаць тэст на цэнтралізаваным тэсціраванні, трэба шмат практыкавацца ў выкананні тэстаў, абавязкова паўдзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні, якое праводзіцца на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі БДУ. Эфектыўнай формай падрыхтоўкі слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання з`яўляецца разбор тэставых заданняў мінулых гадоў.

Адным з важных фактараў навучання з`яўляецца ўласная пазнаваўчая актыўнасць слухачоў. Гэта ўплывае на тэмп, глыбіню і трываласць авалодання вучэбным матэрыялам. Слухачы не толькі выконваюць тэсты, але і самі складаюць тэставыя заданні на зададзеную тэму, і адбываецца ўзаемная праверка ведаў з суседам па парце ці з усёй групай. Актыўны самастойны пошук дазваляе слухачу паверыць у свае сілы, навучыцца пераадольваць цяжкасці. На занятках трэба стварыць умовы для фарміравання жадання вучыцца праз сітуацыю поспеху.

Репозиторий БГМУ

На кожных занятках па беларускай мове выконваюцца тэсты: тэматычныя, напрыклад, па марфалогіі, а таксама абагульняльныя. Таксама практыкуецца вуснае апытванне. Сярод вусных пытанняў, напрыклад, што не з`яўляецца словазлучэннем, назавіце зменныя формы дзеяслова, чым адрозніваюцца пабочныя і ўстаўныя канструкцыі і інш. Слухачам неабходна некаторыя тэмы па беларускай мове завучваць на памяць і перыядычна паўтараць. Напрыклад, у тэме «Правапіс складаных назоўнікаў» трэба запомніць часткі слова, якія пішуцца праз злучок: экс-, лейб-, штаб-, міні-, мідзі-, максі-, вэб-, прэс- і інш. (усяго 16). Ці ў тэме «Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам» трэба запомніць сем пунктаў, калі працяжнік ставіцца і шэсць пунктаў, калі працяжнік не ставіцца. Тым больш, што апошняя тэма заўсёды прысутнічае ў тэсце па беларускай мове на цэнтралізаваным тэсціраванні. Цяжкасць у слухачоў выклікае тое, што не ва ўсіх вучэбных дапаможніках правільна сфармуляваны адзін з пунктаў гэтага правіла. У пункце, калі працяжнік не ставіцца паміж дзейнікам і выказнікам: калі пры выказніку, выражаным назоўнікам у Н. скл., ёсць адмоўе не. Тут важная фармуліроўка: выражаны назоўнікам у Н. скл. Напрыклад, Голад не цётка. Тады слухачы не памыляцца і паставяць працяжнік у сказе: Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць (тут дзейнік і выказнік – інфінітывы).

На занятках па беларускай мове практыкуюцца міні-залікі ў вуснай форме. Напрыклад, па раздзеле “Лексіка і фразеалогія” слухачам трэба даць паняцце наступных тэрмінаў: сінонімы, антонімы, паронімы, амонімы (лексічныя, графічныя, фанетычныя, марфалагічныя), мнагазначныя словы, тэрміны, гістарызмы, архаізмы, прафесіяналізмы, дыялектныя словы, фразеалагізмы, перыфразы і інш. Такім чынам мы можам прасачыць паступовы прагрэс у ведах слухачоў па беларускай мове.

Такім чынам, каб падрыхтоўка слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове была эфектыўнай, патрэбны сістэмны падыход.